№ 3 (65) • САКАВІК 2015

ЮБІЛЕЙКА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ



ДЗЕНЬ ВОЛІ

адзначылі ў Берасці актывісты дэмакратычных сіл



Берасцейскія актывісты Партыі БНФ, БСДП(Г), кампаніі «Гавары праўду», ды іншых арганізацыяў усклалі кветкі на магіле мясцовага дзеяча БНР Адама Трыпуса.

У акцыі ўзялі ўдзел больш за дзясятак чалавек. Прысутныя выступілі з прамовамі, краязнаўца Антось Дацкевіч распавёў пра гісторыю ўтварэння БНР. Актывісты БСДП(Г) разгарнулі партыйны бел-чырвона-белы сьцяг з ружай. Напрыканцы актывісты выгукнулі «Жыве Беларусь!».

Кіраўнік Берасцейскай філіі Партыі БНФ Дзмітрый Шымански лічыць, што наведванне магілы героя БНР – гэта добрая традыцыя:

- Мы мусім ушаноўваць Дзень Волі на могілках. Адначасова зараз такі і святочны настрой, і сумны. Але 25 сакавіка — галоўнае свята беларускай дзяржавы. У аснове сённяшняй дзяржавы ляжаць тыя ідэі незалежнасці, якія былі агучаныя прадстаўнікамі Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918 годзе. І мы традыцыйна ў гэты дзень наведваем магілы, ускладаем кветкі, узгадваем усіх, хто спрычніўся да стварэння Беларускай Дзяржавы. У гэты дзень хочацца павіншаваць усіх берасцейцаў са святам, пажадаць аптымізму, надзеі на лепшае і веры ў нашу перамогу.

Магіла Адама Трыпуса знаходзіцца на Трышынскіх могілках у Берасці. Ён быў беларускім афіцэрам і настаўнікам, дзячом Беларускай Народнай Рэспублікі, які трагічна загінуў пры нявысветленых абставінах у 1965 годзе. Помнік дзеячу БНР, афіцэру і настаўніку Адаму Трыпусу на Трышынскіх могілках Берасця ўсталявалі і асвяцілі ў 2008 годзе. З таго часу ў дзень 25 сакавіка берасцейскія дэмакратычныя актывісты штогод прыходзяць сюды ўскласці кветкі і ўшанаваць яго памяць.

Сёлетняя акцыя адбылася без інцыдэнтаў і затрыманняў, на могілках не было заўважана ні міліцыянтаў, ні людзей у цывільным, як у мінулыя гады.

Паводле Радыё Рацыя, Радыё Свабода



НОВЫЕ ПРАВИЛА ДЛЯ ИПЭШНИКОВ:

товары без документов разрешат, а налог повысят



В ближайшее время в Беларуси должен быть подписан новый указ, определяющий правила торговли товарами легкой промышленности без документов.

Как говорится в разъяснении Министерства по налогам и сборам, индивидуальным предпринимателям-плательщикам единого налога предоставлено право продавать товары без документов, ввезенные с территории стран Таможенного союза.

Правило будет касаться торговых объектов (за исключением магазинов) и торговых мест на рынках. Однако, при этом за осуществление розничной торговли товарами без документов предусматривается уплата единого налога с применением повышающего коэффициента 2 и уплата НДС в фиксированных суммах в увеличенных размерах.

Подписание документа ожидается в ближайшее время.

В Министерстве по налогам и сборам также пояснили, как работать ипэшникам до официального опубликования документа. Те, кто в марте 2015 года планирует осуществлять розничную торговлю товарами без документов, обязаны до начала осуществления деятельности представить налоговую декларацию (расчет) по единому налогу и произвести уплату единого налога и НДС в фиксированной сумме. При этом налоговая декларация представляется на бумажном носителе. В указанной декларации плательщикам следует исчислить единый налог с применением повышающего коэффициента 2 за реализацию товаров без документов и НДС в фиксированных суммах в размере двух ставок единого налога (без учета повышающего коэффициента 2 за реализацию товаров без документов).

То есть, ипэшникам нужно будет заплатить налог по старым правилам.

«После того, как вступит в действие новый указ, ИП нужно будет доплатить единый налог и НДС в фиксированных суммах в зависимости от сумм, которые будут установлены», - пояснили в Министерстве по налогам и сборам. В проекте указа говорится о том, что доплата должна быть произведена не позднее 31 марта 2015 года.

Напомним, 1 марта должен был вступить в силу указ № 222, по которому ипэшники не могли продавать товары легкой промышленности без документов. Предприниматели заявили, что многие из них будут не в состоянии выполнить эти требования и собирались прекращать работу. За день до вступления документа в силу правительство пошло на уступки: ипэшникам дали отсрочку «на ближайшее время» - до тех пор, пока не будет подготовлен новый документ. Однако, 1 марта многие рынки страны пустовали. По данным предпринимательских объединений, на работу не вышло около 80% ипэшников.

tut.by

ВЕЛОСИПЕДИСТАМ НА ЗАМЕТКУ: ВАША ЖИЗНЬ В ВАШИХ РУКАХ

Обстановка с безопасностью дорожного движения продолжает оставаться сложной.

Наиболее травмируемая категория участников дорожного движения по-прежнему – пешеходы и велосипедисты.

Основная часть ДТП с наездом на данную категорию участников дорожного движения совершается в темное время суток – с 18 до 23 часов. А в весенний период количество пострадавших под колесами автомобилей возрастает в 2-3 раза!

Пешеходы и велосипедисты самая уязвимая категория участников дорожного движения. Как бы стремительно не шел процесс автомобилизации жителей нашей области, одной из самой массовой категории участников движения остаются велосипедисты. Ведь не каждый человек может позволить купить себе машину, и постоянно тратить деньги на топливо и дорогие запчасти. Ну а велосипед, это совершенно другое дело: и прост, и удобен, и сравнительно не дорог, доступен практически всем, что в свою очередь делает это средство передвижения поистине общенародным и их количество постоянно растет. К тому же, сейчас ездить на велосипеде еще стало модным!

Но встает вопрос: все ли, прежде чем сеть за его руль, имеют хотя бы «зеленое» понятие о Правилах дорожного движения для велосипедистов?!

В чем кроится причина большинства трагедий на дороге? В первую очередь, это не знание элементарных правил безопасного поведения на дороге и отсутствие взаимовежливости, взаимоуважения между участниками дорожного движения.

Многих трагедий можно было бы избежать, если бы велосипед, в темное время суток, был своевременно оборудован фарами (фонарями) белого цвета спереди, красного – сзади (п.149 ПДД), а велосипедист одет в жилет повышенной видимости.

ПРОЧТИТЕ И ЗАПОМНИТЕ!!!

(Правила движения для велосипедистов (Глава 20).

Помните, что движение на велосипеде должно осуществляться по велосипедной дорожке, а при ее отсутствии — по обочине, тротуару или пешеходной дорожке, не создавая препятствия для безопасного движения пешеходов. При отсутствии указанных элементов дороги или невозможности движения по ним, допускается движение велосипедистов по проезжей части дороги в один ряд не далее 1 метра от ее правого края.

Выезд далее 1 метра от края проезжей части возможен лишь для объезда препятствия, при повороте налево либо развороте.

Велосипедист должен ехать по ходу движения транспортных средств. Так же должен поступать пешеход, ведущий рядом с собой велосипед, обозначенный сигнальными фонарями или световозвращателями, в темное время суток и (или) при недостаточной видимости дороги в случае движения по обочине или по краю проезжей части дороги.

Пересекать проезжую часть по пешеходному переходу велосипедист должен, ведя велосипед рядом(!) (п.151 ПДД).

В нетрезвом состоянии за руль велосипеда садиться нельзя.

Запрещено двигаться по дороге в условиях снегопада и (или) гололедицы.

Нельзя перевозить пассажиров (за исключением перевозки детей в возрасте до 7 лет на дополнительном специально оборудованном сиденье), двигаться, не держась за руль или не держа ноги на педалях.

Дети до 14 лет имеют право управлять велосипедом только на пешеходных и жилых зонах, тротуарах, велосипедных и пешеходных дорожках. Не достигшие 14-летнего возраста, могут выезжать на дорогу только в сопровождении взрослого.

Хотелось бы обратить внимание велосипедистов на соблюдение п.200 ПДД, согласно которого, велосипед должен иметь исправные тормозную систему, рулевое управление и звуковой сигнал, быть оборудован зеркалом заднего вида, спереди световозвращателем белого цвета, сзади– световозвращателем красного цвета, а с каждой боковой стороны – световозвращателями оранжевого цвета.

За Вело-Брест

ПОРТРЕТЫ БРЕСТЧАН

могут появиться на стенах зданий города

Художница Мария Редько предложила нарисовать на стенах домов портреты уроженцев Бреста.

Портреты известных выходцев из Бреста могут скоро появиться на фасадах городских зданий. Среди выдающихся земляков - ассистент Эйнштейна, соавтор теории относительности Яков Громмер, выдающийся терапевт, доктор медицины Роман Лурия и создатель первых моделей «Москвич» Хаим (Ефим Исаакович) Мастбаум. Всего, по задумке автора проекта «Город в лицах» Марии Редько, Брест украсят семь настенных изображений.

«Это люди, которые, по моему мнению, создавали прекрасное, помогали людям и цивилизационному прогрессу», - объяснила выбор городских героев Мария.

Изначально художница планировала украсить пустые стены брестских многоэтажек, но позже появился вариант изображения портретов на центральных улицах. Множество домов в центре города несут культурно-историческую ценность, поэтому выбрать места для портретов здесь проблематично.

«В эскизе я поместила Ефима Мастбаума на здание, являющееся исторической ценностью. Рисовать что-либо на нем оказалось совершенно невозможно», - сообщила художница.

По словам Марии, дома и улицы будут выбираться коллективно на творческом совете в горисполкоме. Пока портретистка занимается разработкой оставшихся иллюстраций героев и поиском спонсоров.



Изображение композитора Айседора Фрида на здании по ул. Гоголя. Эскиз Марии Редько

«Я верю в то, что эти портреты заинтересуют брестчан. Может, даже некоторые истории-биографии героев их взволнуют, дадут стимул поверить в свои силы немножко больше», - поделилась Мария.

По подсчетам художницы, на одну уличную картину уйдет около 6 миллионов рублей. В бюджет проекта входят грузоподъемник, краска и аренда проектора. На все семь картин потребуется около 40 миллионов рублей. На портрет Якова Громмера спонсор уже нашелся.

«В наши стены нужно вдохнуть жизнь. Было бы здорово показывать на них хорошее кино или проецировать выставки», - резюмировала портретистка.

Если все сложится успешно, приступить Мария планирует уже в этом году.

tut.by

ІДЭІ ДЛЯ КУЛЬТУРЫ ПРЭЗЕНТАВАЛІ Ў БЕРАСЦІ НА «КІРМАШЫ ПРАЕКТАЎ»

Міжнароднае грамадскае аб'яднанне "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" зладзіла ў Берасці прэзентацыю культурніцкіх ідэй "Кірмаш праектаў".

Мэта прэзентацыі, ініцыяванай па ўсіх рэгіёнах краіны Згуртаваннем у межах культурніцкай кампаніі "Будзьма беларусамі!", – знайсці і прадставіць шырокай публіцы ідэі, здольныя зрабіць культурнае жыццё горада больш разнастайным і актуальным, а таксама дапамагчы з наладжваннем партнёрскіх сувязей паміж рознымі ўдзельнікамі культурніцкага жыцця пэўнага горада і рэгіёна. Досвед правядзення ўжо каля трыдцаці "Кірмашоў праектаў" пацвярджае зацікаўленасць і фактычныя магчымасці гараджан ў супольнай рэалізацыі цікавых ідэй.

Задачамі "Кірмашу праектаў" у Берасці арганізатары ставяць кансультацыйную і арганізацыйную падтрымку 5 розных па накірунках праектаў:

- "Бацькі. BY" (аўтар: Вольга Крусь, выкладчык БрДУ імя А.С.ПУшкіна, трэнер нефармальнай адукацыі) – інтэрактыўныя заняткі маладых бацькоў або людзей, якія толькі рыхтуюцца імі стаць. Праект варты ўвагі, паколькі прысвечаны захаванню і актуалізацыі традыцыйнай культуры і народнай педагогікі беларусаў дзеля захавання каштоўнасці сям'і.
- "Гісторыя Берасця для імбрыкаў" (Каця Лютыч, супрацоўнік УК "Брэсцкі абласны краязнаўчы музей") – навучальны праект дзеля захавання гістарычнай памяці і развіцця лакальнай ідэнтычнасці гараджан.
- "Клуб універсальных журналістаў" (Наталля Гарайкіна) – ідэя па стварэнні новага інфармацыйнага рэсурсу, які дасць гораду новае пакаленне маладых журналістаў. Праект лічым цікавым для аналізу нішаў у інфармацыйнай прасторы Берасця і акрэслення мэтазгодных шляхоў яе развіцця.
- Стрытарт-праект "Брэсцкая крэпасць-герой" (аўтар: мастак Ілля Нікіцюк) – эскіз у гонар абаронцаў Брэсцкай крэпасці. Хочам адзначаць яго высокую якасць і актуальнасць ў выяўленні, а таксама пакрэслім яго актуальнасць у межах акцыі "Брэст – культурная сталіца Беларусі-2015".
- "Ёгурт" (аўтары – студэнты-журналісты Дзмітрый Босак і Марта Мартынюк) – ідэя, якая можа дапамагчы берасцейскім музыкам быць больш вядомымі і паважанымі ў сваім жа горадзе, дзякуючы належнаму відэапрасоўванню.

budzma.by



ДЭПУТАТЫ НЕ БАЧАЦЬ НАГОДАЎ

для прызначэння «Народнага рэферэндуму»

Два актывісты Руху «За Свабоду» атрымалі адказ з Палаты прадстаўнікоў на заклік ініцыяваць прызначэнне рэферэндуму. Дэпутаты праігнаравалі гэтую прапанову.

Зварот быў разгледжаны ў камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце, адзначаецца ў адказах актывістам Руху Лідзіі Падвойскай і Аляксандру Багатнёву за подпісам старшыні камісіі Генадзя Грыцкевіча.

Па меркаванні дэпутатаў, нагоды для прызначэння рэферэндуму няма. Па-першае, няма сабраных 450 тысячаў подпісаў і зарэгістраваных ініцыятыўных групаў. Па-другое, хаця рэферэндум можа быць ініцыяваны з дапамогай звароту дэпутатаў да кіраўніка краіны (менавіта па гэтай схеме і ідзе збор подпісаў у падтрымку «Народнага рэферэндуму»), але ў Палаце прадстаўнікоў не палічылі неабходным пайсці на такі крок.

«Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў не падтрымалі прапанову аб уключэнні ў парадак дня сесіі і разглядзе на пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў пытання аб правядзення рэспубліканскага рэферэндуму», - адзначана ў адказе.

Пры гэтым, «іншымі суб'ектамі права заканадаўчай ініцыятывы такая прапанова не выносілася», таму «падставы для ўключэння ў парадак дня сесіі Палаты прадстаўнікоў і разгляду прапановы аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму адсутнічаюць».

Народны Рэферэндум ТАК!

«У Палаце прадстаўнікоў прадэманстравалі брак палітычнай адказнасці. Ад бесхрыбетных дэпутатаў, па сутнасці, няма чаго чакаць. Яны грэбуюць законам «Аб зваротах грамадзянаў», больш за тое яны не ўказалі, у якім фармаце было галасаванне пра ўключэнне ў парадак дня сесіі. У самім парадку дня пытання гэтага не было», - пракаментаваў адказ намеснік старшыні Руху «За Свабоду» Алесь Лагвінец.

рух.by

МІЛІНКЕВІЧ: ДЫЯЛОГУ НЯМА АЛЬТЭРНАТЫВЫ

18 сакавіка беларуская дэмакратычная супольнасць упершыню атрымала магчымасць выступіць на пленарным пасяджэнні Парламенцкай асамблеі Еўранэсту.

Агульную пазіцыю дэлегацыі беларускай апазіцыі прадставіў старшыня Руху "За Свабоду" Аляксандр Мілінкевіч.

У сваім выступе палітык адзначыў, што беларускія дэмакратычныя сілы розныя – левыя, правыя, "але ўсе разам адстойваюць права беларусаў жыць у дэмакратыі і незалежнай краіне".

"Дэмакратыя абавязкова прыйдзе, але сёння для нас галоўнае - абараніць незалежнасць, бо яе можна страціць за адну ноч, і тады не будзе ні свабоды, ні правоў чалавека", - сказаў Аляксандр Мілінкевіч.

Ён адзначыў, што "што толькі паступовая еўраінтэграцыя дае нам шанец на захаванне Беларусі".

Дэмакратычныя сілы, па ягоных словах, выступаюць за дыялог унутры краіны: "За тое, каб палітычная дыскусія перш за ўсе вялася не на вуліцах і плошчах, а ў міжнародна прызнаным беларускім парламенце".

"Ва ўмовах пагрозы агрэсіі з боку Расіі нам неабходнае нацыянальнае яднанне", - адзначыў Мілінкевіч.

"Могуць быць цыклы прагрэсу і рэгрэсу, але Еўропа не павінна казаць: "Не хочаце з намі - да пабачэння!" Трэба спрыяць лібералізацыі і росту еўрааптымізму як грамадзянаў, так і ўладаў нашай краіны. Найважнейшае - захаваць тут «смак Еўропы»!" – заявіў Мілінкевіч.

"Дыялог мае дапамагчы правесці ў Беларусі сумленныя выбары. Нам вельмі важна, каб беларускія парламентарыі як роўныя з роўнымі былі прадстаўлены ў Еуранэсце. Сёння мы прапануем кампрамісны варыянт "5+5" (палова дэлегацыі - ад Палаты прадстаўнікоў, палова - ад грамадзянскай супольнасці). Маем надзею, што выбары ў наш парламент 2016 году пройдуць ужо адкрыта, справядліва, мы палічым галасы разам з уладай - у гэтай зале Беларусь стане прадстаўляць паўнавартасная дэлегацыя", - сказаў старшыня Руху "За Свабоду".



"Мы таксама вітаем запрашэнне афіцыйнай беларускай дэлегацыі на Рыжскі саміт Усходняга партнёрства ў траўні, аднак лічым, што на ім павінен быць пачуты таксама голас грамадзянскай супольнасці і палітычнай апазіцыі", - сказаў Мілінкевіч.

рух.by

«НАРОДНЫ РЭФЕРЭНДУМ» ДУМАЕ ПРА СВАЙГО «АДЗІНАГА»

Лідар Партыі БНФ Аляксей Янукевіч заявіў, што яго партыя лічыць неабходным вылучыць сумеснага кандыдата ў прэзідэнты ад кааліцыі «Народны рэферэндум».

Им, по мнению БНФ, должен стать Григорий Костусев.

Алексей Янукевич отметил, что приоритетом для партии является выдвижение кандидата совместно со структурами, входящими в кампанию «Народный референдум».

Костусев, напомним, уже выдвигался в президенты в 2010 году. Тогда кандидат от БНФ набрал, по официальным данным, около 2% голосов (заняв 4 место после Александра Лукашенко, Андрея Санникова и Ярослава Романчука).

По словам Янукевича, на президентских выборах оппозиция должна не столько раскручивать своего кандидата, сколько «работать идеологически», пропагандируя, в частности, идеи независимости.

Он также отметил, что совместному кандидату от «Народного референдума» вряд ли стоит призывать выходить на площадь, так как на фоне конфликта в Украине этот призыв «будет слишком слабым».

Вероятнее всего, совместный кандидат от «Народного референдума» будет назван в середине апреля, сказал Янукевич. Он также сообщил, что в предварительном списке - лидер кампании «Говори правду» Владимир Некляев. Однако, по словам председателя Партии БНФ, Некляев, вероятно, не будет участвовать в президентских выборах в качестве кандидата по своей инициативе.

Лидер движения «За Свободу» Александр Милинкевич не планирует выставлять свою кандидатуру, так как сделал выбор в пользу выдвижения себя ректором Европейского гуманитарного университета, сказал Янукевич.

tut.by



ЮБІЛЕЙКА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

- **Заснавальнік** – Суполка "Усход-2" гарадской арганізацыі Партыі БНФ
- Распаўсюджваецца бясплатна на правах унутранага карыстання
- **Падпісана ў друк** 27.03.2015 года ў 14-00
- Папера афсетная, 0,5 ул.-друк. аркуша, фармат А4. **Гарнітура** Helios.
- Надрукавана на памнажальнай тэхніцы сябраў рэдакцыі.
- **Наклад:** 299 асобнікаў.
- Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі
- **Галоўны рэдактар:** Таццяна ГЕНДЗЕЛЬ
- **Рэдакцыйная калегія:** Наста ПАПЯЛОЎСКАЯ, Кірыл КАТОВІЧ, Ульяна ВЕНЦЭЛЬ.
- **Кантактны тэлефон: (029) 222-58-22, (029) 660-57-41.**
- **E-mail:** jubilejka@tut.by